(ознакомительный фрагмент)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 87/3(Бел.)

Бортнік Ігар Аляксандравіч

ПРАБЛЕМА ТАЛЕРАНЦЫІ Ў ФІЛАСОФСКАЙ І САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМЦЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ПОЛЬШЧЫ XVI-XVII СТСТ.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата філасофскіх навук
па спецыяльнасці 09.00.03 – гісторыя філасофіі

Мінск, 2007

Праца выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік: Лягчылін Анатоль Аляксандравіч
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,
загадчык кафедры філасофіі культуры
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Афіцыйныя апаненты: Дарашэвіч Энгельс Канстанцінавіч
доктар філасофскіх навук, прафесар
прафесар кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага універсітэта
культуры і мастацтваў

Кутузава Наталля Аляксандраўна
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін
установы адукацыі "Інстытут
парламентарызма і прадпрымальніцтва"

Аналіруючая арганізацыя: Інстытут філасофіі Нацыянальнай
Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусь

Абарона адбудзецца 26 чэрвеня 2007 г. у 14 гадзін на паседжанні Савета па абароне дысертацый Д 02.01.13 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўдыторыя 407, тэл. 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы « » мая 2007 года.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый А.П. Жданоўскі

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі

Тэма дысертацыі адпавядае «Пераліку прыярытэтных накірункаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гады» (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17.05.2005 г.) 10.2. «Філасофска-светаноглядныя і логіка-метадалагічныя асновы даследавання праблем прыродазнаўчай і гуманітарнай скіраванасці, гісторыя філасофскага, грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця беларускага грамадства». Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры філасофіі культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў кантэксце ДКІНД «Эканоміка і грамадства» (2006–2010) па тэме «Беларуская філасофская традыцыя ў кантэксце цывілізацыйных парадыгм Захаду і Усходу» (рэгістрацыйны нумар 20061146).

Мэта і задачы даследавання

Мэтай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца эксплікацыя і сістэмны аналіз сутнасці канцэптуальных падыходаў да праблемы талеранцыі і спецыфікі іх тэарэтычнай рэпрэзентацыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI–XVII стст.

Рэалізацыя ўказанай мэты ажыццяўляецца на аснове вырашэння наступных задач:

1. Вызначэнне ідэйна-тэарэтычных і сацыякультурных фактараў, якія абумовілі актуалізацыю праблемы талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст.

2. Даследаванне сутнасці і спецыфічных рыс канцэптуальных падыходаў пры аналізе праблемы талеранцыі ў межах асноўных накірункаў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі ВКЛ і Польшчы пазначанага перыяду («хрысціянска-гуманістычны», контррэфармацыйны, пратэстанцкі, праваслаўны).

3. Вывучэнне спецыфікі ідэй талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы радыкальна-рэфармацыйнага руху, прадстаўленых у межах двух канцэптуальных падыходаў, якія адлюстроўваюць розныя ўзроўні разумення паняцця талеранцыі.

Аб'ектам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца філасофская і сацыяльна-палітычная думка Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI–XVII стст. Прадметам даследавання выступаюць канцэптуальныя падыходы да праблемы талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст.

Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстаны наступныя метады:

1. Метад гісторыка-філасофскай рэканструкцыі, які дазваляе раскрыць гісторыю ўзнікнення, асноўныя этапы фарміравання і развіцця канцэптуальных падыходаў да праблемы талеранцыі.

2. Метад кампаратыўнага аналізу, які з'яўляецца базавым метадам пры супастаўленні і параўнанні розных ідэйна-тэарэтычных падыходаў і канцэпцый. У межах дадзенай працы кампаратывістыка выступае метадам пры вызначэнні спецыфікі як асобных падыходаў да праблемы талеранцыі, так і філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі ВКЛ і Польшчы, якая датычыць дадзенага прадмету, у цэлым.

3. Сістэмны метад, які дазваляе праінтэрпрэтаваць асобныя тэндэнцыі ў развіцці філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI–XVII стст. у якасці цэласнага феномена гісторыка-філасофскай традыцыі.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону

1. Фарміраванне канцэптуальных падыходаў да праблемы талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст., было выклікана, з аднаго боку, уздзеяннем заходнееўрапейскай рэлігійна-філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, з другога, уплывам спецыфічнай сацыякультурнай сітуацыі на геакультурнай прасторы ВКЛ і Польшчы, якая характарызавалася высокім узроўнем рэлігійнай цярпімасці. Менавіта гэты фактар абумовіў адсутнасць радыкальных канцэпцый нецярпімасці ў грамадскай думцы ВКЛ і Польшчы, тэндэнцыю да прызнання больш пазітыўнай ацэнкі феномена талеранцыі ў межах розных ідэйных плыняў у кантэксце кампаратыўнага суаднясення з агульнаеўрапейскай думкай.

2. Асноўнай спецыфічнай рысай канцэптуальнага падыходу рэнесанснага «хрысціянскага гуманізму» да праблемы талеранцыі з'яўляецца утапічны экумепічны праект, што прадугледжвае канвергенцыю дактрынальных сістэм усіх хрысціянскіх канфесій і іх структурную кансалідацыю на аснове кампрамісу, знойдзенага ў свабоднай дыскусіі. Забяспячэнне міжканфесійнай цярпімасці ў грамадстве разглядалася як умова рэалізацыі дадзенага праекту.

3. Контррэфармацыйны рух ВКЛ і Польшчы рэпрэзентуе падыход, у аснове якога знаходзіцца крытычная рэфлексія феномену талеранцыі, заснаваная на рэцэпцыі посттрыдэнцкай каталіцкай дактрыны. Галоўным накірункам выступае крытыка прававой легітымацыі рэлігійнай цярпімасці з дапамогай тэакратычнай ідэі «капланскага каралеўства». Разам з тым для дадзенага падыходу характэрны адсутнасць радыкальных рыс агрэсіўнасці ў параўнанні з контррэфармацыйнай думкай на заходнееўрапейскай культурнай прасторы, а таксама неафіцыйнае прызнанне адноснай талеранцыі як часовай дадзенасці.

4. У межах пратэстанцкай грамадскай думкі канцэптуальны падыход да праблемы талеранцыі эвалюцыянуе ад інструментальнага выкарыстання прынцыпу рэлігійнай цярпімасці ў кантэксце спадзяванняў на дасягненне пануючага становішча ў грамадстве з дапамогай механізмаў дзяржаўнай улады да прыняцця пазітыўнай вартасці феномена талеранцыі, асабліва ў палітыка-прагматычным аспекце, пры захаванні тэалагічнай нецярпімасці. У цэлым названая эвалюцыя мае прагматычны характар.

5. Канцэптуальны падыход праваслаўнай палемічнай думкі да праблемы талеранцыі характарызуе перакананне аб зменлівай вартасці дадзенага феномену як фактару, што спрыяе або перашкаджае развіццю ўласнай канфесіі. Канкрэтныя падыходы, нягледзячы на іх адрозненні, змяняліся ў залежнасці ад сацыяльна-палітычнай сітуацыі, што мела адлюстраванне ў большай або меншай ступені цярпімасці да прадстаўнікоў асобных вызнанняў. Таму падыход праваслаўнай думкі да праблемы талеранцыі выступае як сітуацыйны.

6. Ідэі талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст. знайшлі найбольш паслядоўнае сцвярджэнне ў межах вучэння «Польскіх і Літоўскіх братоў». Спецыфікай дадзенага накірунку з'яўляецца рэпрэзентацыя двух канцэптуальных падыходаў да талеранцыі: ненасілля, што экспліцыравалася з разуменнем талеранцыі ў шырокім значэнні, і верацярпімасці – у вузкім значэнні. Першы падыход эвалюцыянуе ад этычна-абсалютысцкага і сектанцкага варыянту ў раннім антытрынітарызме да сацыніянскага варыянту, які прадугледжвае спалучэнне асуджэння насілля з прагматычным стаўленнем да сацыяльнай рэальнасці і сітуацыйнай этыкай. Другі падыход ўключае ў сябе ідэю аб незалежнасці талеранцыі ад прыняцця пэўнай светапоглядной пазіцыі, а таксама ідэю падзелу функцый дзяржаўных і рэлігійных інстытутаў.

Асабісты ўклад суіскальніка

Даследаванне выканана аўтарам цалкам самастойна. Праведзена праца па выяўленні, зборы, сістэматызацыі і аналізе матэрыялаў. Крытычна асэнсаваны матэрыял крыніц і навуковай літаратуры. Вынікі даследавання, якія ўвайшлі ў дысертацыю, зафіксаваны ў аўтарскіх друкаваных працах.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабіраваны на 6 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і форумах: «VII Республиканская научная конференция студентов и аспирантов (НИРС 2002)» (г. Наваполацк, 21–21 лістапада 2002 г.); «Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Рэфармацыя і грамадства: XVI стагоддзе» (г. Мінск, 29–30 лістапада 2003 г.); «XXI век: Актуальные проблемы исторической науки. Международная научная конференция, посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ» (г. Мінск, 15–16 красавіка

2004 г.); «IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь (НИРС-2004)» (г. Гродна, 26-27 мая 2004 г.); «Международный научный форум «Европа-2004» (г. Мінск, 8-9 чэрвеня 2004 г.); «Международная конференция молодых ученых «Молодежь в науке – 2005» (г. Мінск, 14-18 лістапада 2005 г.); «Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына» (в. Гальшаны – г. Навагрудак, 8-10 верасня 2006 г.).

Апублікаванасць вынікаў

Па тэме дысертацыі аўтар апублікаваў 8 прац, у тым ліку 4 – у рэцэнзаваных навуковых часопісах аб'ёмам 3.62 аўтарскія лісты, а таксама 4 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый аб'ёмам 1.4 аўтарскія лісты.

Структура і аб'ём дысертацыі

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, пяці глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (423 найменні). Поўны памер дысертацыі складае 141 старонку (у тым ліку бібліяграфічны спіс – 34 стар.).

АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

У першай главе «Аналіз бібліяграфіі» прадстаўлены сціслы аналіз літаратуры, якая закранае праблему талеранцыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI-XVII стст. Адзначаецца, што розным аспектам дадзенай праблемы прысвечана значная колькасць даследаванняў у беларускай, польскай, расійскай, украінскай, літоўскай, нямецкай, англійскай, французскай і чэшскай навукі. Існуючая літаратура па тэме дысертацыі падзяляецца паводле храналагічнага і нацыянальнага крытэрыяў.

Першым этапам навуковага аналізу праблемы з'яўляюцца даследаванні расійскіх і польскіх навукоўцаў XIX – пачатку XX стст., у якіх асобныя аспекты ідэй талеранцыі разглядаюцца ў межах вывучэння канфесійнай гісторыі і аналізу рэлігійнай палемікі ў Рэчы Паспалітай XVI–XVII стст. Даследаванні дадзенага перыяду мелі пераважна суб'ектывісцкі характар; зробленыя ў іх высновы былі абумоўлены рэлігійнымі і палітычнымі пазіцыямі аўтараў.

Другі этап звязаны з працамі польскіх навукоўцаў міжваенага перыяду (1920-1930-я гг), у большасці з якіх папулярызуецца ідэя «польскай талеранцыі» як спецыфічнай рысы культуры Рэчы Паспалітай XVI-XVII стст. Дадзеныя працы характарызуюцца разглядам падыходаў да феномену талеранцыі ў кантэксце шырокага аналізу розных накірункаў рэлігійна-філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Разгляд некаторых аспектаў праблемы талеранцыі ўскосна мае месца ў працах украінскіх і беларускіх

даследчыкаў. Аднак у міжваенны перыяд адсутнічаюць даследаванні, спецыяльна прысвечаныя гэтай праблеме.

Наступны этап пачынаецца пасля Другой сусветнай вайны. На яго працягу выяўляецца адрозненне ў падыходах беларускай і украінскай навукі, з аднаго боку, і польскай, з другой. У беларускай і украінскай гісторыка-філасофскай навуцы некаторыя аспекты ідэй талеранцыі разглядаліся ў кантэксце цэласнага аналізу філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі. Аднак праблема талеранцыі не станавілася прадметам непасрэднага даследавання і разглядалася эскізна на фоне іншых гісторыка-філасофскіх пытанняў. У польскай пасляваеннай навуцы з'яўляецца значная колькасць даследаванняў, прысвечаных разглядаемай праблеме. Яны засяроджваюцца на дэталёвым аналізе асобных аспектаў рэлігійна-філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі Рэчы Паспалітай у кантэксце праблематыкі талеранцыі. Былі ўведзены ў навуковы зварот шматлікія крыніцы, якія рэпрэзентуюць падыходы да феномена талеранцыі ў грамадскай думцы ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст. Аднак разам з наяўнасцю істотных дасягненняў даследаванні польскіх навукоўцаў характарызуюцца дыспрапорцыямі пры вывучэнні асобных канцэптуальных падыходаў, а таксама адсутнасцю адзінага разумення паняцця талеранцыі.

Указваюцца таксама друкаваныя і архіўныя крыніцы, выкарыстаныя пры падрыхтоўцы дысертацыйнай работы. Сярод друкаваных крыніц вылучаюцца рэлігійна-філасофскія і сацыяльна-палітычныя творы; зборнікі дакументаў па гісторыі ВКЛ і Польшчы XVI–XVII стст., прысвечаныя розным бакам сацыяльна-эканамічнага і сацыяльна-палітычнага жыцця, заканадаўчыя акты, дакументы арганізацыйных мерапрыемстваў рэлігійных супольнасцяў, дыярыюшы соймаў Рэчы Паспалітай.

У цэлым праблема патрабуе далейшага вывучэння на ўзроўні комплекснага даследавання. Сістэмны канцэптуальны аналіз прадугледжвае разгляд праблемы ў межах трох кампанентаў: рэлігійна-філасофскага, сацыяльна-палітычнага і прававазнаўчага.

У другой главе дысертацыйнага даследавання «Генэзіс і фарміраванне канцэпцый талеранцыі ў заходнееўрапейскай грамадскай думцы» даследуюцца вытокі і станаўленне ідэй талеранцыі ў заходнееўрапейскай грамадскай думцы, вызначаюцца спецыфічныя рысы канцэпцый талеранцыі XVI–XVII стст.

У раздзеле 2.1. «Вытокі ідэй талеранцыі ў заходнееўрапейскай грамадскай думцы» генэзіс ідэй талеранцыі разглядаецца ў апазіцыі да асноўных элементаў сярэднявечнай думкі. Разам з тым перадумовы ідэй талеранцыі змяшчаюцца ў межах галоўных накірункаў познесярэднявечнай

правазнаўчым узроўні ў межах асобных канцэптуальных падыходаў. Разам з тым тэндэнцыя да прызнання большай вартасці феномена талерантнасці ў іх межах у параўнанні з адпаведнымі падыходамі ў агульнаеўрапейскім кантэксце, абумоўленая адметнасцю сацыякультурнай сітуацыі на геакультурнай прасторы ВКЛ і Польшчы, вызначыла іх галоўную спецыфіку.

Сацыякультурныя змены на тэрыторыі ВКЛ і Польшчы ў другой палове XVII – першай палове XVIII стст. выклікалі змяншэнне цікавасці да праблемы талерантнасці ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы, у межах якой назіраецца рэгрэс у дадзеным кантэксце. Актуалізацыя ідэй талерантнасці адбываецца ў другой палове XVIII–XIX стст. ва ўмовах вострай грамадска-палітычнай барацьбы напярэдадні і пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Ідэйна-тэарэтычныя набыткі перыяду XVI–XVII стст. знайшлі сваё месца ў акцэнтуацыі прынцыпу талерантнасці ў філасофскай традыцыі Беларусі і суседніх з ёй краін. Канцэптуальнае абгрунтаванне дадзенага прынцыпу з'яўляецца важным фактарам ва ўмовах практычнага ўвасаблення феномена талерантнасці ў беларускім грамадстве на мяжы XX–XXI стст.

Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў дысертацыі Вынікі, атрыманыя ў дысертацыйным даследаванні могуць улічвацца пры далейшым даследаванні гісторыі філасофіі эпохі Адраджэння і Новага часу на геакультурнай прасторы Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы праграм для вышэйшых навучальных устаноў па гісторыі філасофіі, гісторыі Беларусі і гісторыі краін Цэнтральнай Еўропы, а таксама пры распрацоўцы спецкурсаў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі.

Практычная значнасць даследавання абапіраецца таксама на тое, што сучаснае развіццё беларускага грамадства адбываецца ва ўмовах мірных узаемаадносін паміж прадстаўнікамі розных культурных традыцый. У іх характары акумулюецца гістарычны вопыт практыкі талерантнасці ў духоўнай культуры беларускага народа, а таксама адлюстроўваецца цярпімасць да «іншага» як адна з фундаментальных рыс нацыянальнага менталітэту. Практычнае ўвасабленне феномена талерантнасці ў сістэме грамадскіх адносін Рэспублікі Беларусь патрабуе яго ўсебаковага навуковага аналізу, у тым ліку вызначэння яго крыніц ў беларускай духоўнай культуры. Генэзіс ідэй талерантнасці прадугледжвае зварот да іх адлюстравання ў тэарэтычна-рэфлексіўным выглядзе ў філасофскай думцы Беларусі XVI–XVII стст. у кантэксце геакультурнай прасторы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы. Дадзенае дысертацыйнае даследаванне шляхам аналізу гісторыка-філасофскага матэрыялу спрыяе разуменню сутнасці і спецыфікі міжкультурных узаемаадносін у беларускім грамадстве.

СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

Артыкулы:

1 Бортнік, І.А. Праблема талеранцыі ў дыскурсе контрэфармацыйнага руху на геакультурнай прасторы Беларусі, Літвы і Польшчы / І.А. Бортнік // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1. – С. 94-102.

2 Бортнік, І.А. Вытокі і фарміраванне парадыгмы талеранцыі ў сўрапейскай культуры / І.А. Бортнік // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 2. – С. 89-98.

3 Бортнік, І.А. Эвалюцыя падыходаў да аналізу праблемы талеранцыі ў праваслаўнай сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ XVI-XVII стст. / І.А. Бортнік // Весці НАН Беларусі, серыя гуманітарных навук. – 2005. – № 5, ч. 2. – С. 12-14.

4 Бортнік, І.А. Канцэпцыя талеранцыі ў рэнесанснай с ацыяльна-палітычнай думцы Беларусі, Літвы і Польшчы / І.А. Бортнік // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2006. – № 1. – С. 70-76.

Тэзісы і матэрыялы канферэнцый:

5 Бортнік, І.А. Ідэя ненасілля ў рэфармацыйным руху ў Вялікім княстве Літоўскім (другая палова XVI ст.) / І.А. Бортнік // Материалы VII Республиканской научной конференции студентов и аспирантов (НИРС-2002): в 3 т. – Новополоцк: ПГУ, 2002. – Т. 2. – С. 228-229.

6 Бортнік, І.А. Ідэя непасілля ў кантэксце рэфармацыйнай парадыгмы талеранцыі ў сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI-XVII стст. / І.А. Бортнік // XXI век: Актуальные проблемы исторической науки: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15-16 апр. 2004 г. / редколл.: В.И. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Мн.: БГУ, 2004. – С. 61-63.

7 Бортнік, І.А. Канцэпцыя талеранцыі ў сацыяльна-палітычным вучэнні радыкальнай плыні рэфармацыйнага руху Беларусі, Літвы і Польшчы / І.А. Бортнік // IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь «НИРС-2004»: Тезисы докладов: в 8 ч. / под ред. А.И. Жука. – Гродно: ГрГУ, 2004. – Ч. 4.– С. 154-156.

8 Бортнік, І.А. Адмаўленне насілля ў рэфармацыйным руху ВКЛ (другая палова XVI ст.) / І.А. Бортнік // Рэфармацыя і грамадства: XVI стагоддзе: матэрыялы міжнар. навук. канф., г. Мінск, 29-30 нояб. 2003 г. / уклад. С. Акінчыц, гал. рэд. А. Грыцкевіч. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2005. – С. 341-353.

РЭЗЮМЭ

Бортнік Ігар Аляксандравіч

Праблема талерантнасці ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI-XVII стст.

Ключавыя словы: Варшаўская канфедэрацыя, верацярпімасць, інталеранцыя, канфесія, Контррэфармацыя, ненасілле, «Польскія і Літоўскія браты», праваслаўе, пратэстантызм, Рэнесанс, Рэфармацыя, талеранцыя, філасофская і сацыяльна-палітычная думка, «хрысціянскі гуманізм».

Аб'ектам даследавання з'яўляецца філасофская і сацыяльна-палітычная думка Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI-XVII стст.

Прадметам даследавання выступаюць канцэптуальныя падыходы да праблемы талерантнасці ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI-XVII стст.

Мэта даследавання – эксплікацыя і сістэмны аналіз сутнасці канцэптуальных падыходаў да праблемы талерантнасці і спецыфікі іх тэарэтычнай рэпрэзентацыі ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI-XVII стст.

Метады даследавання. Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстоўваліся метад гісторыка-філасофскай рэканструкцыі, метад кампаратыўнага аналізу, сістэмны метад.

Навуковая навізна. Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання заключаецца ў правядзенні комплекснага даследавання, прысвечанага праблеме талерантнасці ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы Вялікага княства Літоўскага і Польшчы XVI-XVII стст. у айчыннай гісторыка-філасофскай навуцы. Вылучаюцца і ўсебакова характарызуюцца розныя канцэптуальныя падыходы да праблемы талерантнасці ў філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ і Польшчы XVI-XVII стст., вызначаны іх ідэйна-тэарэтычныя вытокі, сутнасныя рысы і спецыфіка.

Тэарэтычная значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што яно дазваляе кампенсаваць прабелы ў гісторыі айчыннай філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі. **Практычная значнасць.** Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы праграм для вышэйшых навучальных устаноў па гісторыі філасофіі, гісторыі Беларусі і гісторыі краін Цэнтральнай Еўропы, а таксама пры распрацоўцы спецкурсаў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі.

РЕЗЮМЕ

Бортник Игорь Александрович

Проблема толерантности в философской и социально-политической мысли Великого княжества Литовского и Польши XVI-XVII вв.

Ключевые слова: Варшавская конфедерация, веротерпимость, интолерантность, конфессия, Контрреформация, ненасилие, «Польские и Литовские братья», православие, протестантизм, Ренессанс, Реформация, толерантность, философская и социально-политическая мысль, «христианский гуманизм».

Объектом исследования является философская и социально-политическая мысль Великого княжества Литовского и Польши XVI-XVII вв.

Предметом исследования выступают концептуальные подходы к проблеме толерантности в философской и социально-политической мысли ВКЛ и Польши XVI-XVII вв.

Цель исследования – экспликация и системный анализ сущности концептуальных подходов к проблеме толерантности и специфики их теоретической репрезентации в философской и социально-политической мысли Великого княжества Литовского и Польши XVI-XVII вв.

Методы исследования. Для достижения поставленной цели использовались: метод историко-философской реконструкции, метод компаративного анализа, системный метод.

Научная новизна. Научная новизна диссертационного исследования заключается в проведении комплексного исследования, посвящённого проблеме толерантности в философской и социально-политической мысли Великого княжества Литовского и Польши XVI-XVII вв. в отечественной историко-философской науке. Выделены и всесторонне охарактеризованы различные концептуальные подходы к проблеме толерантности в философской и социально-политической мысли ВКЛ и Польши XVI-XVII вв., определены их идейно-теоретические истоки, сущностные черты и специфика.

Теоретическая значимость результатов диссертационного исследования заключается в том, что оно позволяет компенсировать пробелы в истории отечественной философской и социально-политической мысли. **Практическая значимость.** Результаты исследования могут быть использованы при подготовке программ для высших учебных заведений по истории философии, истории Беларуси и истории стран Центральной Европы, а также при разработке спецкурсов по истории философской и общественно-политической мысли Беларуси.

SUMMARY

Bortnik Ihar Aliaksandravich

The Problem of Tolerance in the Philosophical and Socio-Political Thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th Centuries

Key words: Warsaw confederation, toleration, intolerance, confession, Counter-Reformation, inviolence, «Polish and Lithuanian brothers», Orthodoxy, Protestantism, Renaissance, Reformation, tolerance, philosophical and socio-political thought, «Christian Humanism».

The object of the research is the philosophical and socio-political thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th centuries.

The subject of the research embraces the conceptual approaches to the problem of tolerance in the philosophical and socio-political thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th centuries.

The purpose of the research is concluded in explicating and complexly analyzing the essence of conceptual approaches to the problem of tolerance and the specificity of its theoretical representation in the philosophical and socio-political thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th centuries.

The methods of the research. In achieving the purpose, the method of historico-philosophical reconstruction, the method of comparative analysis, the systemic method were employed.

The scientific novelty. The scientific novelty of the dissertation research consists in conducting the complex investigation, dedicated to the problem of tolerance in the philosophical and socio-political thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th centuries in the national historico-philosophical science. Various conceptual approaches to the problem of tolerance in the philosophical and socio-political thought of the Grand Duchy of Lithuania and Poland in the 16-17th centuries have been singled out and exhaustively characterized; their conceptual-theoretical origins, essential features and specificity have been designated.

The theoretical value of the results of the dissertation research evidences itself in their capacity to fill in the gaps in national philosophical and socio-political thought. **The practical value.** The materials of the dissertation research can be used in working out syllabuses on philosophy, history of philosophy, history of Belarus and East-European countries for higher educational establishments. Also, the materials of the dissertation are applicable in elaborating special courses on the history of philosophical and socio-political thought of Belarus.